# Бібліатэка - выстаўка краязнаўства.

Адначасна з адчыненьнем усебеларускай краязнаўчай канфэрэнцыі, у беларускім аддзеле Дзяржаўнай Бібліатэкі адчынена выстаўка кніг па краязнаўству. Усяго было прадстаўлена каля 250 экземпляраў кніг і брашур.

На выстаўцы былі сабраны ўсе крыніцы і літаратура па агульнаму краязнаўству, усе існуючыя на Беларусі кніжкі і брашуры па краязнаўству у школе.

Выдатнае месца займаў куток нашага ведомага краязнаўца —нябожчыка Сапунова. Апрача яго ўсіх выданьняў, тут жа была зьмешчана і ўся перапіска, як з асобнымі выдатнымі дзеячамі, так і з археолёгічнымі т-вамі і краязнаўчымі арганізацыямі.

Кідалася ў вочы адсутнасьць спэцыяльнага выданьня працы цэнтральнага бюро краязнаўства Беларусі і спэцыяльнай літаратуры па кіраваньню вывучэньнем краязнаўства ў масовых беларускіх умовах.

Выстаўка была пабудована выключна дзеля ўдзельнікаў усебеларускай краязнаўчай канфэрэнцыі і зачынена адначасна са скончэньнем працы канфэрэнцыі.

Ня гледзячы на тое, што выстаўка была пабудована насьпех і аб ёй ня было ніякай абвесткі, памяшканьне не магло пад час стаўпіць усіх жадаючых пабываць на ёй. Прыходзіла шмат і прыватных грамадзян.

Г. Няхай.